# СЯМЕЙНАЕ ВЫХАВАННЕ: З ГІСТОРЫІ І СУЧАСНАСЦІ

## Навукова-папулярны агляд

*В. У. ЧЭЧАТ,*
***загадчык лабараторыі сямейнага выхавання Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук***

**(Заканчэнне. Пачатак у № 9)**

### Абвяшчэнне культу сям'і і сямейнага выхавання

Насуперак усім ультрамодным «тэорыям» і «практычным эксперыментам» сям'я як першасная біясацыяльная ячэйка выстаяла ва усіх краінах свету. Яе устойлівасць пацвярджае наступны вывад: хоць і відавочны рост разводау, аднак колькасць сямей не змяншаецца. Гэта значыць, што тыя, хто скасавау шлюб, рана ці позна уступаюць у новы ці вяртаюцца да ранейшага. Як сведчыць статыстыка, для XX ст. увогуле характэрна змяншэнне колькасці людзей, якія ніколі не уступалі у шлюб, і наадварот, павелічэнне колькасці асоб, якія знаходзяцца у шлюбе. У Рэспубліцы Беларусь, напрыклад, 2 млн. 750 тыс. сямей, у якіх налічваецца больш за 9 млн. чалавек, г. зн. 90—92 % усяго насельніцтва рэспублікі.

У большасці развітых краін свету у 80-х — пачатку 90-х гг. прыкметна акрэслілася адзіная тэндэнцыя да умацавання сям'і, абвяшчэння яе культу, да паунацэннага развіцця і выхавання дзяцей. Так, у Францыі пры абследаванні у шкале «шчасце» каля 90 % жанчын на першае месца паставілі «сямейны ачаг». Аналагічная сітуацыя наглядаецца у ЗША: большасць амерыканак выказваюцца за вернасць сямейнаму укладу жыцця. У Беларусі у перыяд з 1980 па 1986 г. колькасць разводау не толькі стабілізавалася, а нават зменшылася (на жаль, у пачатку 90-х гг. яна па розных прычынах зноу павялічылася).

У 1989 г. Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый абвясціла 1994 г. Міжнародным годам сям'і. Дарэчы, па рашэнню ААН, пачынаючы з 1994 г., 15 мая кожны год будзе адзначацца ва усіх краінах свету як Міжнародны дзень сям'і. У дакументах Арганізацыі Аб'яднаных Нацый сям'я разглядаецца у якасці асноунай ячэйкі грамадства, якая выконвае важныя сацыяльна-эканамічныя функцыі, забяспечвае натуральнае асяроддзе для эмацыянальнай, фінансавай і матэрыяльнай падтрымкі, што неабходна для росту і развіцця яго членау, асабліва малых дзяцей, а такама для клопату аб іншых утрыманцах — састарэлых, інвалідах і нямоглых. Сям'я застаецца найважнейшым асяроддзем зберажэння і перадачы культурных каштоунасцей.

У Рэспубліцы Беларусь Саветам Міністрау прынята пастанова «Аб правядзенні у рэспубліцы Міжнароднага года сям'і». У ёй вызначаны шэраг мер, якія накіраваны на павышэнне ролі сям'і у грамадстве, яе матэрыяльную і сацыяльную падтрымку і абарону.

Сям'і і сямейнаму выхаванню вялікая увага удзяляецца у Канцэпцыі адукацыі і выхавання у Беларусі і Канцэпцыі выхавання у нацыянальнай школе Беларусі (распрацаваныя у Нацыянальным інстытуце адукацыі). У першай з іх падкрэслена, што сям'я стварае чалавеку неабходныя умовы для жыццядзейнасці, забяспечвае яго абароненасць пры розных акалічнасцях, што бацькі і родзічы аказваюць выхавауча уплыу на чалавека на працягу усяго яго жыцця (дапамагаюць маладым пры стварэнні сям'і, доглядзе дзяцей, пры матэрыяльных і псіхалагічных цяжкасцях). Для рэалізацыі гэтых і іншых выхавауčых функцый і магчымасцей сям'і неабходна стварыць спрыяльныя умовы:

садзейнічаць з боку дзяржавы і грамадства (заканадауча, матэрыяльна, маральна) павышэнню статусу сям'і як асноунай ячэйкі грамадства і першай школы дзіцяці;

узмацніць адказнасць (маральную, матэрыяльную, адміністрацыйную, крымінальную) бацькоу за выхаванне дзяцей і захаванне іх здароуя;

арганізаваць адпаведную падрыхтоуку моладзі да сямейнага жыцця і выхавання дзяцей;

распрацаваць рэкамендацыі па сямейнаму выхаванню і развіццю дзіцяці з мэтай яго сацыяльнага уваходжання у дашкольную установу і школу;

распачаць падрыхтоуку спецыялістау па сямейнаму (дамашняму) выхаванню і навучанню дзяцей (гувернёрау);

палепшыць выданне дапаможнікау і іншай літаратуры, арганізацыю тэле- і радыёперадач па праблемах сямейнага выхавання.

У Канцэпцыі выхавання у нацыя-

нальнай школе Беларусі указваюцца дзве асноуныя прычыны таго, чаму каля паловы сямей рэспублікі не спрауляюцца з выхаваннем дзяцей. Гэта, папершае, нізкі статус сям'і у грамадстве і яе слабае сацыяльна-эканамічнае становішча і, па-другое, нездавальняючыя псіхолага-педагагічная падрыхтоука, культура і атмасфера самой сям'і. Каб значна узняць яе выхаваучую ролю, неабходна праводзіць канкрэтную работу па умацаванню матэрыяльнага дабрабыту сям'і і павышэнню агульнай культуры бацькоу.

### Важныя накірункі у сучасным сямейным выхаванні

Вучоныя большасці краін свету сцвярджаюць, што найбольш эфектыуным з'яуляецца выхаванне дзяцей у сям'і як агульначалавечым асяроддзі (мікракалектыве) жыццядзейнасці дарослых і дзяцей. Іменна у сям'і пачынаецца сацыялізацыя асобы, ажыццяуляецца перадача назапашанага чалавецтвам вопыту, закладваюцца асновы працоуных навыкау, маральных прынцыпау, норм паводзін, адбываецца этычная і практычная падрыхтоука дзяцей да сямейнага жыцця. Праграмай Міжнароднага года сям'і, іншымі актамі ААН, якія звязаны з сям'ёй, найважнейшай яе функцыяй вызначана выхаваучая (побач з дэмаграфічнай, сацыяльна-эканамічнай, псіхалагічнай і інш.). Дзяржава, грамадскія і прыватныя арганізацыі, падкрэсліваецца у гэтых дакументах, павінны аказваць сям'і рознабаковую дапамогу (эканамічную, медыцынскую, псіхолага-педагагічную, інфармацыйную і інш.) з тым, каб яна як мага больш эфектыуна выконвала названую вышэй функцыю і рыхтавала дзяцей паунацэннымі і свядомымі грамадзянамі, працаунікамі, сем'янінамі.

Якія ж важныя напрамкі на сучасным этапе у сямейным выхаванні падрастаючай змены у свеце і у Рэспубліцы Беларусь?

1. Атрыманне усімі дзецьмі якаснай адукацыі, якая давала б ім магчымасць хутка адаптавацца да новых умоу жыццядзейнасці, новых тэхналогіі, форм арганізацыі вытворчасці і інтэлектуальнай сферы у грамадстве, дабівацца, дзякуючы адукацыі, значных поспехау ці проста выжыць у зменлівых і супярэчлівых сацыяльна-эканамічных умовах.

2. Гуманнае унутрысямейнае размеркаванне дамашніх абавязкау і функцый (працоуных, аказання дапамогі малым дзецям, састарэлым, інвалідам і нямоглым членам сям'і).

3. Сістэматычнае навучанне моладзі усіх узростау асновам сямейнага жыцця. Мэтай і задачамі такога навучання з'яуляюцца: забеспячэнне правільнага разумення абавязкау у сямейным жыцці і міжасобасных адносінах; садзейнічанне фарміраванню сямейных каштоунасцей; падрыхтоука маладых людзей да жыцця у грамадстве; аблягчэнне працэсу іх пераходу ад юнацтва да жыцця дарослага чалавека, уступлення у самастойную працу; набыццё уменняу і навыкау па выхаванню дзяцей.

4. Забеспячэнне усіх сямей неабходнай інфармацыяй з мэтай папярэджання у іх насілля, а таксама правапарушэнняу, злачынствау, злоужывання наркотыкамі і спіртнымі напіткамі, палавой распусты і распаусюджання захворванняу. Аказанне дапамогі сем'ям, што пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы, сацыяльна-псіхалагічнымі асаблівасцямі (прыкметамі) якіх з'яуляюцца сацыяльны песімізм, настрой утрыманства і супрацьстаяння. Ажыццяуленне медыка-псіхолага-педагагічнай рэабілітацыі бацькоу і дзяцей, таму што чарнобыльская катастрофа стварыла такую сітуацыю, калі сям'я працяглы час жыве без дзяцей, а дзеці — без бацькоу, што прыводзіць да змен у псіхічным стане дзяцей (праяуленне нематываванай агрэсіунасці, дэпрэсіунага стану, няупэуненасці, трывожнасці, адчужанасці).

5. Захаванне і перадача дзецям культурных каштоунасцей чалавецтва і свайго народа, народных традыцый сямейнага выхавання; улік ва умовах станаулення Рэспублікі Беларусь як незалежнай дзяржавы працэсу адраджэння сямейных традыцый і звычак, метадау, сродкау і форм выхавання дзяцей, якія заснаваны на прынцыпах народнай педагогікі беларусау і сямейным укладзе радаслоунай.

6. Сістэматычная асвета і навучанне бацькоу, што павінны садзейнічаць:

абароне дзяцей на усіх узроставых ступенях, асабліва пры пераходзе іх ад маленства да дарослага жыцця і працы, на аснове Канвенцыі аб правах дзіцяці (1989 г.), Сусветнай дэкларацыі па забеспячэнню выжывання, абароны і развіцця дзяцей (1990 г.), Закона Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці» (1993 г.);

выпрацоуцы і развіццю у моладзі агульначалавечых каштоунасцей і мадэлей паводзін, грамадзянскай адказнасці, забеспячэнню роуных правоу, забароне дыскрымінацыі і нацыяналістычных праяуленняу, зберажэнню навакольнага асяроддзя;

разуменню і прымяненню гуманных метадау і сродкау бацькоускага выха-

вання, дзякуючы якім выхаваучыя функцыі размяркоуваюцца паміж абодвума бацькамі і якія прыводзяць да значнага паляпшэння адукаванасці і выхаванасці дзяцей, умацавання іх здароуя, падрыхтоукі да грамадскага і сямейнага жыцця.

### Шляхі і сродкі дапамогі сям'і у выхаванні дзяцей

Для павышэння выхаваучай функцыі сям'і, акрамя умацавання яе матэрыяльных асноу, важна значна узняць агульную і педагагічную культуру бацькоу, ажыццявіць дыферэнцыраванае псіхолага-педагагічнае навучанне (а не толькі асвету, як рабілі раней) усіх катэгорый бацькоу. Паусюдна у развітых краінах свету такія сістэмы існуюць. Там цвёрда ведаюць: каб выхаваць дзяцей, спачатку трэба навучыць і выхаваць усіх бацькоу, у тым ліку і тых, якія збіраюцца пакінуць сям'ю і дзяцей. Напрыклад, у ЗША тыя бацькі, якія разводзяцца, павінны абавязкова прайсці спецыяльны курс у школе і атрымаць пасведчанне, якое неабходна прадставіць у суд. Калі такога пасведчання у бацькоу не акажацца, суд не будзе разглядаць справу аб скасаванні шлюбу. Можа узнікнуць пытанне: «А дзеля чаго усё гэта? Надумаліся развесціся — ніхто не стрымае». Адказ можа быць адзін: гэта патрэбна не столькі бацькам, колькі дзецям. Спецыялісты па сямейнаму выхаванню у школе пераканауча паказваюць, як скасаванне шлюбу бацькоу уплывае на псіхіку дзіцяці, яго эмацыянальнае і фізічнае здароуе, на адносіны з бацькам і маці, з сябрамі і навакольнымі людзьмі, як гэтая жыццёвая трагедыя можа пауплываць на змену паводзін і характару дзіцяці у бліжэйшы час і у будучым.

У нашай рэспубліцы да 1988 г. пад лозунгам правядзення педагагічнага бацькоускага усенавуча педагагічнай асветай бацькоу займаліся на грамадскіх асновах установы адукацыі і у першую чаргу агульнаадукацыйныя школы. Але гэта не прыносіла станоучых вынікау. Па-першае, таму, што у школах не было адпаведных спецыялістау па рабоце з сям'ёй і па праблемах сямейнай педагогікі, па-другое, што педагагічная асвета хоць і дэкларавала дыферэнцыраваную работу з сям'ёй, але на практыцы слаба улічвала яе. Менавіта мэтанакіраваных і сапрауды дыферэнцыраваных псіхолага-педагагічных ведау не атрымлівалі ні бабулі і дзядулі, ні сталыя і маладыя бацькі, ні адзінокія маці і асобы, якія замяняюць бацькоу, ні юнакі і дзяучаты, што збіраліся ствараць сем'і і стаць бацькамі. Вось чаму сёння неабходна не проста абнауленне работы установ адукацыі па псіхолага-педагагічнай асвеце бацькоу. Важным напрамкам дапамогі сям'і, як паказвае вывучэнне станоучага айчыннага і замежнага вопыту, становіцца дыферэнцыраванае псіхолага-педагагічнае навучанне (замест асветы) і кансультаванне усіх катэгорый бацькоу сіламі кваліфікаваных спецыялістау. Педагогі, псіхолагі, сямейныя сацыяльныя педагогі, юрысты, эканамісты, урачы здолеюць аказаць сям'і канкрэтную і дзейсную дапамогу па праблемах эканомікі, права, медыцыны, псіхалогіі, сексалогіі, сямейнай педагогікі, народных традыцый сямейнага выхавання. Іх інфармацыя і кансультацыі паспрыяюць папярэджанню насілля у сям'і, правапарушэнняу, злачынствау, злоужывання наркотыкамі і спіртнымі напіткамі, распаусюджвання захворванняу.

Цяпер у Беларусі хоць і павольна, але няухільна пачынае стварацца будучая сетка установ і службау дапамогі сям'і і дзецям (цэнтры сацыяльнай падтрымкі сям'і, Беларускі дзіцячы фонд, Беларускі фонд сацыяльнай падтрымкі дзяцей і падлеткау «Мы — дзецям», службы планавання сям'і, усынаулення і апекавання, медыка-педагагічныя, псіхолага-педагагічныя цэнтры і службы, школы і факультэты для сталых і маладых бацькоу, будучых бацькоу і маці і інш.). У прыватнасці, школу бацькоу на базе СШ № 13 г. Мазыра наведваюць тыя жанчыны, якія чакаюць нараджэння дзіцяці. Тут яны навучаюцца рацыянальным паводзінам, рэжыму працы, харчавання, адпачынку. Ім даюцца веды па фізіялогіі і псіхалогіі дзіцяці. Педагагічная і экалагічная адукацыя, якая сканцэнтравана у адным прадмеце «Экалогія чалавека», выхоувае унутраную культуру, фарміруе экалогію духу маці і яе будучага дзіцяці.

Псіхолага-педагагічныя службы рэспублікі у многім аказваюць дапамогу сем'ям, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы. Спецыялісты іх дапамагаюць «зняць» у дзяцей, што доугі час жывуць асобна ад бацькоу, дэпрэсіуны стан, няупэуненасць, трывожнасць, адчужанасць ад бацькоу і іншых дзяцей, нематываваную агрэсіунасць. Псіхолагі, урачы, юрысты, педагогі сумесна з работнікамі Міністэрства адукацыі, Беларускага дзіцячага фонду праводзяць навучанне і кансультаванне, аказваюць практычную дапамогу бацькам-выхавацелям дзіцячых дамоу сямейнага тыпу (ДДСТ) і тым бацькам, якія усынауляюць дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся

без апекі бацькоў. Для бацькоў-выхавацеляў ДДСТ падрыхтаваны дапаможнік «Такая незвычайная сям'я» (пад рэдакцыяй Л. І. Смагінай і В. У. Чэчата.— Рэд.), у якім даюцца карысныя парады па навучанню і выхаванню прыёмных і родных дзяцей у новай незвычайнай сям'і.

Шмат дзе ў сельскай мясцовасці ў апошнія гады пачалі ствараццa установы новага тыпу (дзіцячы сад — школа, комплексы (цэнтры) развіцця дзяцей, дзіцячы дом — школа — дзіцячы сад і інш.), якія разам з мясцовымі органамі улады ажыццяўляюць сацыяльна-эканамічную і псіхолага-педагагічную дапамогу сям'і і дзецям, а таксама адначасова з'яўляюцца і ачагамі нацыянальнай культуры. Напрыклад, Дулебскі дзіцячы дом — школа — дзіцячы сад Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці аказвае сацыяльна-эканамічную дапамогу вяскоўцам, у прыватнасці па працаўладкаванню жанчын-маці, якія маюць малых дзяцей, прымае на выхаванне дзяцей-сірот з дзіцячых дамоў, рыхтуе будучых сельскіх працаўнікоў. Больш таго, гэта новая установа стала для ўсіх бацькоў вёскі Дулебы агульным домам духоўнага, працоўнага, маральнага станаўлення іх дзяцей і іх саміх. Бацькі, дзеці, настаўнікі сумесна удзельнічаюць у гурце беларускай народнай песні «Дулебцы», у клубах «фальклярыст», «Крыніца», працуюць у гуртках і на невялікім школьным заводзе «Дулебскія умельцы» (разьба па дрэву, выпільванне, пляценне, выраб рэчаў для хатняга ужытку і інш.). Выхаванцы займаюцца вывучэннем сваіх каранёў, гісторыі роднага краю, народных традыцый, бацькоўскай спадчыны. У курсе «Народазнаўства» дзеці з цікавасцю знаёмяцца з традыцыямі сваіх продкаў, з роляй маці як заснавальніцы роду (I—IV класы), з радаслоўнай, з паняццямі «род», «радня», «родная зямля», «Радзіма» (V клас), з арганізацыяй абрадаў нараджэння, вяселля, пахавання, з найбольш характэрнымі звычаямі у горадзе і на вёсцы (VI клас), з радаслоўнай і паходжаннем імёнаў беларусаў (VII клас).

У рэспубліцы ўжо больш за тры гады дзейнічаюць сацыяльныя педагогі (сярод іх ёсць і сямейныя сацыяльныя педагогі). Назапашаны пэўны вопыт дзейнасці сацыяльна-педагагічнага комплексу на базе СШ № 16 г. Бабруйска. Тут у педагагічным мікрасоцыуме устаноўлены сувязі школы адкрытага тыпу з мікраараёнам, сям'ёй. Яны ажыццяўляюцца праз дзейнасць школьнага псіхолага, сацыяльных педагогаў, сацыяльных работнікаў, арганізатараў культурна-забаўляльнай і спартыўна-аздараўленчай дзейнасці, педагогаў-кансультантаў. Створана сістэма дзейнасці сацыяльных педагогаў у СШ № 59 г. Мінска і некаторых іншых. У сферу дзейнасці сацыяльных педагогаў уваходзяць, як правіла, мікраараён школы, сям'я, маладзёжныя аб'яднанні, падлеткавыя клубы, культурна-аздараўленчыя цэнтры, цэнтры занятасці моладзі, пазашкольныя установы, апякунскія саветы і інш. Сацыяльныя сямейныя педагогі аказваюць канкрэтную дапамогу сем'ям у наладжванні ўзаемаадносін, вырашэнні сямейных канфліктаў, маральна-псіхалагічным аздараўленні сям'і.

Мэтанакіраваную дапамогу ў самых розных напрамках аказваюць сям'і дашкольныя установы рэспублікі. Першы з іх — работа па сацыяльнай абароне дзяцей. У сувязі са складанай і супярэчлівай сацыяльна-эканамічнай сітуацыяй у 1991—1992 гг. у рэспубліцы ліквідавана 361 дашкольная установа (з іх 302 — у сельскай мясцовасці). Вядзецца продаж гэтых устаноў розным камерцыйным структурам. Узрастае плата бацькоў за наведванне дзецьмі дашкольных устаноў. У такіх умовах існуючыя з іх з'яўляюцца адным са сродкаў сацыяльнай абароны бацькоў і дзяцей. Міністэрства адукацыі, мясцовыя органы улады сумесна з работнікамі дашкольных устаноў робяць усё для таго, каб дзеці наведвалі гэтыя установы і выхоўваліся ў іх. Створаны пазабюджэтныя фонды, якія матэрыяльна падтрымліваюць ведамасныя дашкольныя установы.

Другі напрамак — мэтанакіраваная і кваліфікаваная падрыхтоўка дзяцей да школы. Сёння, калі многія дзеці не наведваюць дзіцячыя сады і калі пераважная большасць бацькоў не падрыхтавана ў псіхолага-педагагічным плане, малыя ў сем'ях не атрымліваюць паўнацэннага інтэлектуальнага і эмацыянальнага развіцця, у многім адстаюць ад сваіх равеснікаў, якія наведваюць дзіцячыя сады і з якімі праводзіцца мэтанакіраваная выхаваўча-адукацыйная работа (дарэчы, у Даніі дашкольным выхаваннем ахоплена 95 % дзяцей, вялікі працэнт ахопу такім выхаваннем і ў Германіі, Галандыі і многіх іншых краінах). Сістэма дашкольнага выхавання ў нашай рэспубліцы таксама мае багаты станоўчы вопыт і высокакваліфікаваныя кадры выхавацеляў, якасна рыхтуе дзяцей да школы, паўнацэнна іх развівае. Цяпер у нас усё больш з'яўляецца дашкольных устаноў, якія даюць дзецям музычную, мастацкую, харэаграфічную, спартыўную падрых-

тоуку, веданне замежных моу, карысныя працоуныя навыкі і уменні, якія (за рэдкім выключэннем) не у сілах пакуль што даць бацькі.

Трэці напрамак — **псіхолага-педагагічная асвета і навучанне бацькоу, сумесная работа выхавацеляу і бацькоу па выхаванню дзяцей.** Сацыёлагі Нацыянальнага інстытута адукацыі Р. Зеляніцкая і В. Чэснавіцкая сведчаць, што толькі 23,7 % бацькоу (з 250 апытаных) узровень сваіх ведау лічаць дастатковым для правільнага фарміравання і развіцця асобы дзіцяці, 53,5 % адчуваюць недахоп ведау па дзіцячай псіхалогіі, 35,2 % — па педагогіцы, 28,2 % — па культуры, этыцы і эстэтыцы. Многія бацькі адзначаюць, што на псіхолага-педагагічную адукацыю і самадукацыю у іх не хапае часу (89,1 %), не могуць знайсці неабходнай псіхолага-педагагічнай літаратуры (31,1 %) (Вынікі сацыялагічнага даследавання // Настаўніцкая газета. 1994, 14 мая).

Практыка паказвае, што псіхолага-педагагічнае навучанне бацькоу праходзіць больш паспяхова і дзейсна, калі яны сумесна з выхавацелямі прымаюць удзел у выхаванні і развіцці сваіх дзяцей. Калі раней большасць бацькоу эпізадычна наведвала сходы, лекцыі, адкрытыя заняткі у дашкольных установах, дык у апошнія гады значна узрастае колькасць тых, хто пад кірауніцтвам выхавацеляу сістэматычна удзельнічае у выхавауча-адукацыйнай рабоце сваіх дзяцей у дзіцячым садзе і дома. Для бацькоу, якія займаюцца дамашнім выхаваннем дзяцей, вучоныя Нацыянальнага інстытута адукацыі (па заказу Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь) падрыхтавалі «Праграму сямейнага выхавання дзяцей ранняга узросту для бацькоу». У ёй улічваецца, што сярод бацькоу ёсць такія, якія здольны выступаць даволі падрыхтаванымі выхавацелямі, а ёсць і такія, якім патрэбна кансультацыя выхавацеляу і іншых спецыялістау па выхаванню дзяцей.

Думаецца, што з цягам часу у Рэспубліцы Беларусь будуць прыняты практычныя захады да таго, каб стварыць спецыяльны Інстытут сям'і, які стане каардынаваць работу усіх устаноу і службау сям'і, аказваць ёй дзейсную псіхолага-медыка-юрыдычна-педагагічную дапамогу, праводзіць навуковыя даследаванні па многіх актуальных праблемах выхавання дзяцей у сям'і. У прыватнасці, такіх, як сямейныя структуры, працэс фарміравання і распаду сям'і, сямейныя функцыі, тыпы сямей, вызначэнне іх патрэб, крытэрыі вызначэння сямей, якія знаходзяцца у цяжкім становішчы, узаемасувязь сямей з іншымі сацыяльнымі структурамі, адраджэнне і зберажэнне народных традыцый у сямейным выхаванні, падрыхтоука моладзі да сямейнага жыцця, спецыфіка функцыяніравання, жыццядзейнасці, сямейнага укладу гарадскіх і сельскіх сем'яу, узаемаадносіны бацькоу і прыёмных дзяцей, праблемы дзіцячых дамоу сямейнага тыпу і інш.

### Рэкамендуем прачытаць

**Байярд Р., Байярд Д.** Ваш беспокойный подросток: практическое руководство для отчаявшихся родителей: Пер. с англ. М.: Просвещение, 1991.

**Горбатенкова Л. М.** Отец и семья. Мн.: Полымя, 1993.

**Джеймс Ч. Добсон.** Родителям и молодоженам. М.: Центр общечеловеческих ценностей, 1992.

**Закон Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці».** Мн., 1993.

**Кэмпбелл Р.** Как на самом деле любить детей. **М. Максимов.** Не только любовь. **Лич П.** Младенец и ребенок: от рождения до пяти лет: Пер. с нем. М.: Педагогика, 1988.

**Никитина Л. А.** Мама и детский сад. М.: Просвещение, 1990.

**Спок Б.** Разговор с матерью. Пер. с англ. М.: Прогресс, 1987.

**Спок Б.** Ребенок и уход за ним: Пер. с англ. Л.: Политехника, 1991.

**Сухомлинский В. А.** Мудрость родительской любви. М.: Молодая гвардия, 1988.

**Торре Д.** Ошибки родителей: Пер. с итал. М.: Прогресс, 1993.

**Такая необычная семья** / Под ред. Л. И. Смагиной, В. В. Чечета. Мн.: НИО, 1994.

**Фромм А.** Азбука для родителей: Пер. с англ. Л.: Лениздат, 1991.

**Чечет В. В.** Умеем ли мы общаться с детьми? Мн.: Народная асвета, 1987.